УДК 821.161.3 – 1 (бел)

**І. А. Бароўская** (Гомель)

# «МОЙ ЧАРОЎНЫ БЕЛАРУСКІ КРАЙ, БАЦЬКАЎШЧЫНА СВЕТЛАЯ МАЯ»: ПАЭТЫЧНАЯ ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

У 2020 годзе споўнілася 90 год са дня нараджэння выдатнага пісьменніка, паэта, драматурга, публіцыста, сцэнарыста, перакладчыка, класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча. Неяк склалася такая традыцыя, што большасць з нас успрымае яго як аўтара першага беларускага гістарычнага рамана «Каласы пад сярпом тваім». Але шырыня яго захапленняў выклікае павагу: навелы, апавяданні, літаратурныя артыкулы, аповесці, вершы, раманы. Пэўны перыяд у сваім жыцці У. Караткевіч жыў у Кіеве. Гэты горад запаланіў яго душу, выклікаў гэтую незвычайную зацікаўленасць гісторыяй. Як вынік – з-пад яго пяра выходзіць аповесць «Лісце каштанаў». Цікавасць да сваіх каранёў У. Караткевіч пранёс праз усё жыццё, менавіта да сваіх, родных бацькоўскіх мясцін, да дома ў Рагачове, пабудаванага яго дзедам Васілём у 1914 годзе. Гэта любоў глыбока ўвайшла ў сэрца і душу, нарадзіла, падняла з глыбінь душы і сэрца гонар, павагу і адначасова крыўду за некаторых, што сталі *хлопамі*, якія *Не любяць Радзімы, не любяць мовы… Іваны без роду і племені!*:

*Што ім з таго, што за кнігу і слова*
*Народ сем стагоддзяў ставаў у стрэмя?!..*
*Хамы лічаць заўсёды «хамскім»*
*Матчыну песню і матчыну хату* («Фантазія») [1].

Сам пісьменнік прысвячаў вершы сваім землякам, выказваў шчырыя словы любові да роднай зямлі. Мясціны Рагачова натхнялі, суцяшалі душу. У. Караткевіч грунтоўна вывучаў гісторыю, вылучаўся энцыклапедычнымі ведамі. У час вучобы ў Кіеўскім універсітэце на філалагічным факультэце рускага аддзялення пісьменнік пачаў цікавіцца гісторыяй Беларусі, шмат выданняў прачытаў пра нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863–1864 гадоў. Магчыма, адыграў сваю ролю той факт, што даўні продак пісьменніка, як перадавалі яго сваякі, Тамаш Грыневіч удзельнічаў у гэтым паўстанні, за што быў расстраляны недзе пад Рагачовам. Студэнцкія гады сфарміравалі У. Караткевіча як асобу незалежную, сумленную, з гонарам за сваю Айчыну, гістарычную спадчыну. Менавіта ў Кіеве сфарміравалася яго грамадзянская пазіцыя і выпрацавалася жаданне займацца пытаннямі гістарычнага мінулага Беларусі. Яго вельмі прыцягвалі факты паўстання 1863–1864 гадоў, у выніку чаго з’явілася задума аб напісанні твора пра падзеі, абставіны таго перыяду. Летам 1950 года з’явіўся першапачатковы варыянт «Дзікага палявання караля Стаха».

Вялікі ўплыў на пісьменніка аказала творчасць Янкі Купала, Якуба Коласа. Дарэчы, Якубу Коласу ён паказаў свае першыя вершы, апавяданні, казкі.

Выпадак адыграў важную ролю ў лёсе У. Караткевіча. Здарылася так, што свае асобныя вершы ён паказаў свайму сябру. Вось, як успамінаў сам пісьменнік той самы выпадак («Дарога, якую прайшоў»): «Напісаў я за дзевяць год – горы. Нават трагедыю белым вершам, жахліва трагічную. Але друкавацца і не думаў. У канцы першага года маёй настаўніцкай работы адбылося, аднак, нечаканае.

Мінскі сябра (С. Карпенка) папрасіў мяне даслаць яму вершы, пачытаць. Я даслаў, як бывала і раней. А ён панёс іх у часопіс «Полымя». І раптам улетку 1955 года я атрымаў нумар часопіса са сваім вершам «Машэка». Гэта пераламіла мой лёс. Потым з'явіліся яшчэ вершы» [3].

У вершы апяваўся герой з беларускіх легендаў. Як адзначаў Р. Бярозкін, галоўная вартасць «Машэкі» – у *песеннай атмасферы, у якой жыве і дзейнічае герой легенды* [2]. Вось гэта і стала момантам, пасля якога У. Караткевіч вырашыў займацца гістарычнай літаратурай. Але вядомы і зборнікі вершаў славутага класіка: «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі (вершы і паэмы)», «Мая Іліяда», «Быў. Ёсць. Буду», «Паэзія розных гадоў».

Паэтычная творчасць Уладзіміра Караткевіча вылучаецца інтэлектуальнасцю і філасофскім зместам, глыбінёй, эмацыянальнай напоўненасцю і адкрытасцю. Яго паэзія выхоўвае, выклікае любоў да слаўнага мінулага Айчыны, душа яго «*крычыць*» ад непаразумення:

*Я джунглі і ў нас адшукаць сумею.*
*Сцяблінка звычайнай расянкі балотнай*
*Цікавей жывей за ўсе архідэі.*
*У дрэвах з мармуру – іх зваць бярозамі,*
*У вежах з карункавым іхнім уборам,*
*Я добра бачу ўчарашнія слёзы*
*І сённяшні смех з барацьбою поруч* («Фантазія») [1].

Найлепшай краінай засталася ў яго *вёска Амерыка, што пад Оршай.* Душа паэта не вытрымлівае, ён рэзка, эмацыянальна выказваецца пра тых, хто адвярнуўся ад родных каранёў, хто забыў сваіх продкаў:

*А вы льяцё па чужому слёзы,*
*Забыўшы радзімы простыя кветкі,*
*І любіце вершы ёлупаў розных.*
*Вядома, свінню прыцягвае сметнік* («Фантазія») [1].

Уладзімір Караткевіч быў цвёрда перакананы, што абавязковае пранікненне ў гістарычную памяць Беларусі не дазволіць нам згубіць сувязь паміж мінулым і сучасным, дапаможа пазбегнуць памылак. Строгасць і высакароднасць прасочваецца ў кожным радку яго вершаў. Аўтар не саромеецца ў выказваннях, выкарыстоўвае рэзкія словы ў абарону сваёй радзімы:

*Маю радзіму, маю зялёную,*
*Забыць і ў разрад нецікавых сунуць?*
*Мала вам плюнуць у твары*
*Чакайце! Яшчэ калі-небудзь плюнуць!*
*А я ў народ наш заўсёды веру...* («Фантазія») [1].

У вершы «Ёсць паданне вякоў, што разбурыць калісь» паэт з вялікай любоўю гаворыць пра родную мову з дапамогай яскравых эпітэтаў і ад'ектыўных параўнанняў: *трапяткая і сіняя, як васілёк, гарачая, як прамень.* Твор кранае сваёй душэўнай шчырасцю, адданасцю, яскрава бачыцца непахісная грамадзянская пазіцыя аўтара – няма жыцця без роднай мовы:

*Хай пятля, хай памерці ў журбе,*
*Хай не будзе ні шчасця, ні будучых дзён,*
*Калі ў іх не будзе цябе* [1].

Сіратой называе сябе паэт без мовы, без слоў анёла *Братка, здароў.* Мова для паэта *ясны хлеб, каханы май, песня продкаў, нашчадкаў палі*:

*Без цябе, не з табой – не патрэбен мне рай.*

*На душы. Ў небясі. На зямлі* («Быў. Ёсць. Буду») [1].

Мова для пісьменніка і *булатны клінок*, мова *гордая*, якую і тады народ не забудзе, *калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок* («Беларуская песня») [1].

І як страшна паўтарыць лёс таўраў, калі ў Крыму знаходзяць муры, руіны былога народа, што згінуў і знік невядома чаму. Уладзімір Караткевіч ездзіў у Крым, даследаваў, разважаў і з глыбокім сумам стварыў верш «Таўры», калі стаяў у гарах і ўяўляў, што *ён не ізгой, Не паэт з беларускіх узгоркаў сініх, А апошні таўр Народа свайго*:

*Крый нас,божа, калі і нас нас*

*Нашчадкі*

*Паглядзяць, Як мы*

*На таўраў*

*Глядзім* [1].

Нам трэба ў паэта вучыцца так любіць радзіму, так адчуваць смак кожнага слова, зразумець той сум, што перадаецца ў вершы «Мокрыя травы» пасля першага радка *Я сумую па радзіме*. І вось ужо перад намі вырастае вобраз радзімы, яе *лугі і нівы, трыпутнікі, укроп, белая бульба, ціхая паляна, хаты, росныя шаты, канавы, кураслеп, лопух, дажджы і сонца, вільгасць сонечнага лета, коні, жарабя, што бяжыць па лузе, вясёлка*. Лексемы-назоўнікі акаляючай прыроды, развітыя вобразнымі азначэннямі (*рэчкі ціхія і лянівыя, мокры край*), іншы раз метафарычнымі вобразамі (*цёплы мёд яе маліны*) струменяцца ў радку, адлюстроўваючы, душэўнасць, пяшчоту, прастату фактуры і глыбокі лірызм. Як адчувальна сардэчнасць тону, шчырасць, элегічна-сузіральны настрой пры перадачы аўтарам пачуццяў да сваёй радзімы, да роднай Беларусі. Разгорнутай метафарай гучаць радкі *лясная казка, святая песня, Свет адзіны ў вачах*, параўнанне з каханай дзяўчынай дапамагае намаляваць краявіды роднай старонкі: *тугія ўзгоркі – нібы грудзі каханай дзяўчыны...; азёры сінія – нібы вочы яе*. Падобнае сустракаем і ў вершы «Снягір»: *О радзіма, мой светач цудоўны, адзіны, Явар мой, мой агністы снягір на сасне*.

Разгорнуты вобраз радзімы, такі ўсеабдымны, доказны *калумбам зямлі незнаёмай*, што марэць *пра піраміды над Нілам:*

*А што вы ведаеце пра краіну,*

*Ў якой вас маці на свет нарадзіла?*

*Яна вам нудная, шэрая, сумная.*

*Ясце яе бульбу, ясце яе сала,*

*А самі былі толькі ў мінскім ДУМе,*

*Ды чулі аднойчы імя Купалы* («Калумбы зямлі незнаёмай») [1].

Якая страснасць, эмацыянальная напоўненасць сустракае нас у радках-доказах, што наша краіна – лепшая: у нас *буслы чорныя, бабры разумныя, скокі жоравяў на весніх азёрах.., Мядзведзі лечацца травамі горкімі, Шукаючы дзікі часнок на лузе, Павук-серабранка ў гняздо пад чаротамі Носіць паветра дзецям пад пузам* («Калумбы зямлі незнаёмай»).

Беларусь для Уладзіміра Караткевіча – *акіян*, у кожнай кроплі якога звініць, адгукваецца незгасальнае жыццё продкаў, што разам з храмамі і гарадамі сышлі ў нетры зямныя. А крыніцы зямлі нашай будуць жыць вечна, і жыць з імі будзе *давеку наш мужны і мудры, вялікі народ* («Надпіс на камяні над крыніцай»).

Спасцігаючы творчасць паэта, міжволі задумваешся аб тым, што непарыўнасць пакаленняў звязвае гістарычнае мінулае, якое нараджае павагу, гонар за продкаў, садзейнічае спасціжэнню народнай мудрасці, што перадаецца ад роду да роду. І Уладзімір Караткевіч разумеў гэта. Ён, акунуўшыся ў гісторыю краіны, суправаджаў свае разважанні рытарычнымі пытаннямі:

*Унукі Скарыны,*

*Дзе ваш гонар, моц, краса?* («Верш Багдановічу») [1];

*Дзе мой край?*

*Там, дзе мудрыя продкі ў хвоях паснулі* («Беларуская песня») [1].

Нельга абысці ўвагай той факт, што творчасць Караткевіча прыцягвае ўвагу беларускіх бардаў і рок-музыкантаў. Так, у свой час, да 80-годдзя паэта, былі выдадзены 2 альбомы Зміцера Вайцюшкевіча пад назвай «Беларуская песня» і «Дзе мой край», куды ўвайшлі песні на вершы Уладзіміра Караткевіча, напісаныя аўтарам у розныя часы. У альбомы ўкладзены буклеты з тэкстамі песень і вершы Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна і іншых, прысвечаныя класіку. Акрамя таго, рамантычная недаказаннасць пачуццяў, неспакой у спалучэнні са светлым сумам прыцягвалі ўвагу кампазітараў пры стварэнні рамансаў: Я. Глебава «Любы мой», Л. Мурашкі «Дагарэў за брамай неба край» і іншыя.

У заключэнні неабходна адзначыць, што паэтычная творчасць Уладзіміра Караткевіча адкрывае яго для наступных пакаленняў, як грамадзяніна, высакароднага лірыка-філосафа, узнёслага і шчырага рамантыка.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская палічка. Беларуская электронная бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Uladzimir_Karatkievic/Na_Bielarusi_boh_zyvie.html. – Дата доступу : 03.11.2020.

2. *Бярозкін, Р.* У добры час. Артыкул пра творчасць У. Караткевіча (урыўкі). 1956 г. [Электронны рэсурс] / Р. Бярозкін // Машынапіс. – Рэжым доступу : http://archives.gov.by/home/tematicheskie-razrabotki-arhivnyh-dokumentov. – Дата доступу : 28.10.2020.

3. *Караткевіч, У.* Дарога, якую прайшоў [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч. – Рэжым доступу : https://karatkevi.ch/bio/letapis.html. – Дата доступу : 28.10.2020.